

# «БАЗАР» ПАЧЫНАЕ ЗДЗІЎЛЯЦЬ...

**Учора, хай сабе і не афіцыйна, але стартаваў міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Нагадаем, што ўрачыстая цырымонія адкрыцця 24-га па ліку фэсту адбудзецца 9 ліпеня. Карэспандэнты «Звязды» паназіралі за «апошнімі акордамі» падрыхтоўкі да свята.**

## «СТРЭС-КАНФЕРЭНЦЫЯ»...

Па добрай традыцыі за пару дзён да пачатку «базару» адкрываюцца выставы, паказваюць спектаклі, гледачоў запрашаюць на канцэрты.

Так, у Мастацкім музеі адкрылася выстава арыгіналаў твораў Далі і Пікаса. На радзіме Шагала такога яшчэ не было. Ды і эксклюзіў у тым, што ўпершыню прадстаўлена кераміка адразу двух геніяў.

У Летнім амфітэатры прайшлі першыя канцэрты з удзелам «зорак»: «Шоу Аляксандра Алешкі» і «сольнік» Грыгорыя Лепса. У рамках традыцыйных «базарных» «Тэатральных сустрэч» Генадзь Хазанаў у канцэртнай зале «Віцебск» прадставіў праграму з інтрыгуючай назвай «Стрэс-канферэнцыя». А ў «коласаўскім» тэатры творчы калектыў з Масквы паказаў спектакль «Вясна» па апавяданнях Міхаіла Задорнава.

Сёння ў ратушы гледачоў чакаюць на прэзентацыі выстаўкі «Жывапіс Паднябеснай» і рэспубліканскай выставы сучаснага мастацкага тэкстылю «Злучальная нітка». У Летнім амфітэатры з сольнымі канцэртамі выступяць Валерый Меладзэ і Ірына Алеграва...

## ШТО НОВАГА НА ПЛОШЧЫ?

Галоўная плошча горада і наваколлі — любімае месца адпачынку ўдзельнікаў «базару». Там праводзяцца фестывальныя акцыі, якія збіраюць мноства гледачоў. Напярэдадні фэсту старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Шарстнёў з адным са сваіх намеснікаў прайшоўся па плошчы, а потым запрасіў на планёрку адказных асоб. І выказаў заўвагі. У прыватнасці, у парку Пераможцаў забараніў прадаваць спіртное. Нельга, каб ля выставы ваеннай тэхнікі, атракцыёнаў, дзе любяць бавіць час дзятва, куплялі піва і больш моцныя напоі. Пры гэтым было выканана яшчэ адно заданне па ўстаноўцы лавак непадалёку ад баявых машын. Раней, пакуль хлопчыкі і дзяўчаткі залазілі на барты, гулялі там, татам і мамам прыходзілася чакаць стоячы. Ніжэй — на беразе Заходняй Дзвіны — усталявалі біяпрыбіральні. Шчыра кажучы, раней іх вельмі не хапала. Асабліва ў выхадныя, калі і ў згаданым вышэй парку і на набярэжнай натоўп.

Мікалай Шарстнёў упэўнены, што на «базары» дробязяў не бывае. Наконт набярэжнай дадзена ўказанне «ажывіць» яе яшчэ больш. А гэта магчыма дзякуючы трансляцыі музыкі, вулічным мастакам. Нагадаю, што ініцыятарам стварэння парку і рэканструкцыі галоўнай плошчы былі былы кіраўнік вобласці, цяперашні кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандр Мікалаевіч Косінец. Скептыкі не верылі ў тое, што перайначаныя зоны адпачынку стануць «мекай» для гараджан і прыезджых. Але ж задуманае атрымалася, як той казаў, на ўсе 100! І абноўленая плошча з новым паркам сталі цудоўным куткам старажытнага Віцебска.



Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

## НЕ АДАРВАЦЦА АД ЭКРАНА!

У дырэкцыі «базару» канстатуюць, што сёлета з'явілася прыемная «праблема»: спатрэбілася дадаткова вырабляць і ўсталёўваць флагштокі, бо колькасць краін, чые грамадзяне прыбудуць на фестываль, нечакана павялічылася. У прыватнасці, у маладзёжных праектах пажадалі ўдзельнічаць прадстаўнікі Германіі і Аўстрыі. Асвятляць падзеі фэсту ў апошні момант пажадаў журналіст з Нікарагуа. Летась на «базары» акрэдытаваліся больш за 4450 удзельнікаў. Сёлета чакаецца рэкорд.

Па традыцыі напрыканцы чэрвеня першымі з іншаземцаў прыязджаюць масквічы, якія манціруюць дэкарацыі ў Летнім амфітэатры і светлавое абсталяванне. На чарговым «базары» галоўная сцэна ператворыцца ва ўрачыстую: з калонамі і грандыёзнымі жырандолямі. Цэнтральны з экранаў, уявіце сабе, памерам больш за 36 квадратных метраў, а бакавыя — па 24. «Здача пад ключ» усёй гэтай прыгажосці ўжо прайшла. Адказныя за тэлетрансляцыю паабяцалі, што гледачы змогуць «адарвацца ад экрана» толькі падчас рэкламы! Бо настолькі прыгожай будзе тэлевізійная «карцінка». У канцэртнай зале «Віцебск», дзе пройдзе дзіцячы конкурс, з'явяцца «прагрэсіўныя» святлодыёдныя экраны. А спецыяльны подыум на сцэне з падсветкамі забяспечыць каласальны эфект. Дзятва ў выніку апынецца «ў касмічнай прасторы».

У Віцебску ўжо адчуваецца атмасфера свята. Зроблена ўсё, каб яно было цікавым і бяспечным. Прыязджайце і самі ў гэтым пераканаецеся.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

## БЯСПЕКІ ШМАТ НЕ БЫВАЕ

Каб, не дай Бог, нічога не здарылася ў Летнім амфітэатры, ратавальнікі правялі вучэнні. А калі што, ліквідуюць пажар аператыўна.

— Правялі вучэнні на самым галоўным аб'екце «Славянскага базару», дзе будзе знаходзіцца найбольшая колькасць гледачоў. Праверылі магчымасці пад'езду, працаздольнасць унутранага і вонкавага водазабеспячэння, сістэмы апавяшчэння... Была зроблена ўстаноўка 48-метровых лесак з падачай вады, іншыя элементы, неабходныя для хуткага рэагавання на магчымыя надзвычайныя здарэнні, — паведаміла «Звяздзе» **прэс-сакратар Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Марына ФАНДО**.

Выратавальнікі адпрацавалі алгарытм дзеянняў усяго на 17 фестывальных пляцоўках, а таксама і ў 12 гатэлях і інтэрнатах, каля 40 аб'ектах харчавання.

Міліцыянеры абяцаюць па традыцыі быць ветлівымі і ўпершыню выкарыстаюць «назіральны комплекс».

— Калегі з Мінскай вобласці перададуць відэакомплекс на колах, які будзем усталёўваць там, дзе шмат людзей. Напрыклад, на кірмашах і ў «Горадзе майстроў». Гэта сучасны комплекс з апаратурай высокай якасці. Яна паспяхова прымяняецца як для прафілактыкі правапарушэнняў, злачынстваў, так і для іх раскрыцця «па гарачых слядах». Фактычна тая машына — «штаб»: з сувяззю і аптымальным дыяпазонам назірання, — растлумачыў карэспандэнту **начальнік УУС Віцебскага аблвыканкама, генерал-маёр міліцыі Віктар СЯНЬКО**.

Сярод іншага міліцыянеры будуць сачыць за парадкам на скутарах.

---

**Крынічка**

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# МЕНЮ ДЛЯ АГУРКОЎ



**Агурок нездарма набыў усенародную славу — у ім удала спалучаюцца зялёны свежы водар, хрумсткасць, сакавітасць і нізкая каларыйнасць. Пажыўнасць гэтай гародніны, праўда, зусім невялікая. Агуркі складаюцца на 95-96% з вады, змяшчаюць усяго да 2,5% цукраў, 1% бялковых рэчываў, 0,1% тлушчу і вітаміны.**

**Тэма падкормкі агуркоў заўсёды важная і актуальная, бо недакармілі або перакармілі — і роўных пухірыстых салодкіх здаравякоў ужо не відаць, прыйдзецца здавольвацца выродлівымі «коскамі»...**

## Віды і формы падкормак

За ўвесь летні сезон кустам агуркоў цалкам дастаткова правесці 3-4 падкормкі. Як правіла, мы ўжываем мінеральныя або арганічныя ўгнаенні.

А па спосабе ўнясення яны могуць быць каранёвыя ці пазакаранёвыя.

Каранёвыя падкормкі падыходзяць для цёплага лета. Тады каранёвая сістэма агуркоў развіта добра, і падкормкі ідуць «на ўра». Іх раяць праводзіць пасля дажджу або добрага паліву. Найлепшы час — вячэрні, ці ў пахмурны негарачы дзень.

Пазакаранёвыя падкормкі будуць карысныя ў выпадку, калі лета халоднае, а надвор'е пахмурнае. Карані ў халодны час з засваеннем харчавання не спраўяцца. А вось апырскванне лісця будзе якраз тое, што трэба. Такая падкормка праводзіцца ўвечары або хмарным днём, невялікімі дозамі. Вельмі важна, каб пажыўны раствор распыляўся дробнымі кропелькамі і раўнамерна. Чым даўжэй ён пратрымаецца на лісці, тым больш патрэбных рэчываў паспее засвоіць расліна.

## Рэжым

I падкормка — праз 15 дзён пасля пасадкі;

II падкормка — у пачатку цвіцення;

III падкормка — падчас масавага плоданашэння;

IV падкормка — таксама ў перыяд плоданашэння; яе мэта — падоўжыць тэрмін плоданашэння агурочных плецяў і зрабіць яго больш багатым.

**ВАЖНА!** Ёсць і такое меркаванне: калі агуркі на вашай глебе цудоўна растуць і пладаносяць, то не варта перабіраць з падкормкамі — можна абмежавацца адной або дзвюма.

## Састаў

Абапіраючыся на апрабаваную рэцэптуру, можна выбраць самую ўдалую «падборку» для вашай глебы, умоў надвор'я і кашалька.

**Першая**

*Арганіка:* свежы курыны (ці перапёлчын) памёт у канцэнтрацыі 1:15. Выкарыстоўваць свежапрыгатаваны; гнаявая жыжка ў канцэнтрацыі 1:8; каровін або конскі гной у канцэнтрацыі 1: 6; настой зялёнай травы ў канцэнтрацыі 1:5.

*Мінеральныя ўгнаенні:* 1 сталовая лыжка мачавіны + 60 г суперфасфату на 10 літраў вады; 10 г аміячнай салетры + 10 г суперфасфату + 10 г калійнай солі на 10 л вады; 5 г амафосу ўнесці ў зямлю (рассыпаць і падрыхліць глебу).

**Другая**

*Арганіка:* настой зялёнай травы ў канцэнтрацыі 1:5.

*Мінеральныя ўгнаенні:* 20 г калійнай салетры + 30 г аміячнай салетры + 40 г суперфасфату; 1 шклянку попелу на 10 літраў вады; суперфасфат + попел у сухім выглядзе ўнесці ў зямлю.

*Пазакаранёвая падкормка:* 35 г суперфасфату на 10 л вады; 1 ч. лыжка борнай кіслаты + 10—12 крышталікаў марганцоўкі на 1 л вады; 2 г борнай кіслаты + 100 г цукру на 1 л гарачай вады (апырскваць для прыцягнення насякомых-апыляльнікаў).

**Трэцяя**

Арганіка: зялёнае ўгнаенне ў канцэнтрацыі 1:5.

*Мінеральныя ўгнаенні:* 25-30 г калійнай салетры на 10 л вады; 50 г мачавіны на 10 л вады; 1 шклянка попелу на 10 л вады.

*Пазакаранёвая падкормка:* 10-12 г мачавіны на 10 л вады.

**Чацвёртая**

*Арганіка:* 2-дзённы настой прэлага сена.

*Мінеральныя ўгнаенні:* 28-30 г соды харчовай на 10 л вады; 1 шклянка попелу на 10 л вады.

*Пазакаранёвая падкормка:* 15 г мачавіны на 10 л вады.

**ВАЖНА!** Падкормка попелам лічыцца вельмі эфектыўным сродкам на любым этапе росту агуркоў. Існуе меркаванне, што яе можна ўжываць праз кожныя 7-10 дзён увесь час, пакуль не скончыцца плоданашэнне.

## КАРЫСНЫЯ «АГУРОЧНЫЯ» ПАРАДЫ

Калі агуркі пачынаюць гарчыць, значыць, ім не хапае вільгаці, ці на іх паўплывалі рэзкія перапады начных і дзённых тэмператур. Неабходна забяспечыць багаты паліў цёплай адстоянай вадой не толькі пад корань, але і па ўсёй плошчы градкі.

Калі форма агуркоў нагадвае лямпачку (звужэнне ў раёне пладаножкі) або кручок, значыць, не хапае калію. Неабходна дадаць у рацыён попельныя апырскванні і палівы — па 1 л пад корань. Можна апырскваць і растворам фасфату калію па рэцэпце: 1 ч. лыжка на 1 л вады.

Калі агурочкі звужаныя ля кончыка, але патоўшчаная ля пладаножкі, гэта паказвае на недахоп азоту. Пра азотнае галаданне сведчаць таксама тонкія агурочныя плеці; лісты, якія сталі драбнейшымі, чым звычайна; светлыя, нават бялявыя (а не ярка-зялёныя) агурочкі. Тут на дапамогу прыйдзе арганіка: рэкамендуецца паліў растворам каравяку 1:10, па 1 л пад корань.

Калі цяжка вызначыць, якога элемента не хапае агурочкам, лепш за ўсё падкарміць іх комплекснымі ўгнаеннямі з мікраэлементамі. А комплекс — ён і ёсць комплекс, патрэбны элемент сам знойдзе свайго «кліента».

---

# Кросчайнворд



**1.** Упершыню пераклаў на рускую мову работу К. Маркса «Капітал». **2.** Воўк кожны год ліняе, а яе не мяняе. **3.** Цвёрдая набойка на падэшве абутку пад пятой. **4.** Як гэтае свята прыйшло — бяры рукавіцы ў запас. **5.** Добрая яна даражэй за багацце. **6.** Байбак бяжыць, аж балахон дрыжыць. **7.** Гімнастычная прылада. **8.** Грашовая рэнта на Беларусі ў XV — 1-й палове XIX ст. **9.** Вагавая і грашова-лікавая адзінка Баварыі, Польшчы ў II—XVI стст. **10.** Паляўнічая сетка для лоўлі звяроў і птушак. **11.** Словы, аднолькавае па гучанні, але адрознае па значэнні. **12.** Атаман бандытаў у палескай хроніцы І. Мележа. **13.** Тое, што флексія. **14.** У гэтай азіяцкай сталіцы Марка Пола ўпершыню ўбачыў папяровыя грошы. **15.** Гэтыя акуляры не надзенеш. **16.** Рускі жывапісец, карціна якога «Партрэт доктара М.І. Бера з жонкай Н.М. Бер» знаходзіцца ў Дзяржаўным мастацкім музеі Беларусі. **17.** Адна з найбольш старажытных і ўшанаваных багінь грэчаскага пантэона. **18.** Адзіны Бог мусульманскай рэлігіі. **19.** Перасpелае воблака. **20.** Наплечны шнур на мундзіры параднай формы генерала. **21.** Аркестравы духавы музычны муштуковы інструмент. **22.** Гэта яго словы: «Ад вялікага да смешнага адзін крок». **23.** Нашэсце ворага. **24.** Старшыня валвыканкама ў Юравічах з палескай хронікі І. Мележа. **25.** Першы ўладальнік асабняка «Белы дом» у ЗША ў 1810 г. **26.** Спартыўны комплекс у ваколіцы Мінска. **27.** Савецкі пісьменнік-сатырык, аўтар выразу «Аўтамабіль не раскоша, а сродак перамяшчэння». **28.** Тутавае дрэва, вырошчваецца ў пакоях і аранжарэях. **29.** Гук ці спалучэнне гукаў у слове. **30.** Партовае збудаванне для рамонту суднаў. **31.** Лабараторная пасудзіна. **32.** Гліняная або металічная пасудзіна з высокім вузкім горлам і дзвюма вертыкальнымі ручкамі. **33.** Выканаўча-распарадчы орган кіраўніцтва. **34.** Паўвостраў, які скардзіцца на свае памеры.

**Уладзімір ЕСМАНТОВІЧ.** *г. Мінск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

1. Лапацін. 2. Натура. 3. Абцас. 4. Спас. 5. Слава. 6. Авечка. 7. Абруч. 8. Чынш. 9. Шкоец. 10. Цянёта. 11. Амонім. 12. Маслак. 13. Канчатак. 14. Кабул. 15. Ларнет. 16. Трапінін. 17. Немезіда. 18. Алах. 19. Хмара. 20. Аксельбант. 21. Трамбон. 22. Напалеон. 23. Навала. 24. Алейка. 25. Адамс. 26. Стайкі. 27. Ільф. 28. Фікус. 29. Склад. 30. Док. 31. Колба. 32. Амфара. 33. Адміністрацыя. 34. Ямал.

---

**Даты | Падзеі | Людзі**

## 8 ЛІПЕНЯ

**1680** год — 335 гадоў з часу нараджэння Трубніцкага Юрыя, магілёўскага летапісца. З 1725 года — член Магілёўскага магістрата, з 1734-га — рэгент гарадской канцылярыі. Напісаў адну з частак Магілёўскай хронікі (запісы пра падзеі 1701—1746 гг.). Асабліва падрабязна апісаў падзеі 1710-х гадоў — перыяду Паўночнай вайны (1700—1721), намаляваў яркія вобразы гістарычных асоб таго часу. Пры складанні хронікі выкарыстаў успаміны сучаснікаў і ўдзельнікаў падзей, дакументальныя матэрыялы магілёўскага архіва, гісторыка-літаратурныя крыніцы. Трубніцкі вызначаўся шырынёй поглядаў, юрыдычнай дасведчанасцю, смелай грамадзянскай пазіцыяй, дэмакратызмам. Хроніка мае вялікую каштоўнасць як помнік літаратуры і гістарыяграфіі Беларусі эпохі барока. Памёр у 1747 годзе.

**1709** год — адбыўся вырашальны эпізод Паўночнай вайны (1700—1721) — Палтаўская бітва. У ёй удзельнічалі руская армія Пятра I і шведская армія Карла XII. Пасля таго, як Пётр I адваяваў у шведаў Лівонію і заснаваў новы горад-крэпасць Санкт-Пецярбург, шведскі кароль Карл XII прыняў рашэнне атакаваць цэнтральную Расію з захопам Масквы. Ён павёў свае войска на Маскву з поўдня, праз Украіну, і ў гэтым была яго галоўная памылка. Яму перашкодзілі неспрыяльныя кліматычныя ўмовы. Да таго моманту, калі шведская армія падышла да Палтавы, Карл быў паранены, страціў трэць арміі, а яго тылы былі атакаваныя казакамі і калмыкамі. У выніку Палтаўскай бітвы армія Карла XII перастала існаваць. Кароль разам з украінскім гетманам Мазепам, які здрадзіў Пятру і перайшоў на бок шведаў, уцяклі ў Бесарабію.



**1861** год — нарадзілася Магдалена Радзівіл, дзеячка беларускага культурнага руху, мецэнатка. Нарадзілася ў сям'і вядомага беларускага археолага і этнографа Завішы-Кіжгайлы, які паходзіў са старажытнага беларуска-літоўскага роду. Пасля смерці бацькі Марыя Магдалена стала адной з самых багатых землеўладальніц. Рана заўдавела і атрымала ў спадчыну маёмасць мужа, шляхетнага і заможнага графа Крысінскага. Частку свайго багацця Марыя Магдалена ахвяравала на дзяцей-сірот — адкрыла для іх шэраг прытулкаў. Вяла асветніцкую дзейнасць. У сваіх вёсках адкрыла школы, стварыла таварыства цвярозасці. Устанавіла студэнтам Віленскага ўніверсітэта некалькі стыпендый. Але галоўнае месца ў дзейнасці Марыі Магдалены Радзівіл займала падтрымка першых беларускіх перыядычных выданняў. Яна апекавалася выдавецтвам «Загляне сонца і ў наша ваконца» ў Пецярбургу, «Нашай нівы», на яе грошы былі выдадзены першыя кнігі Максіма Багдановіча і Канстанцыі Буйло. Вялікую і ўсебаковую дапамогу Магдалена Радзівіл аказвала і творчай моладзі. Пасля 1917 г. знаходзілася ў эміграцыі ў Польшчы, Літве, Германіі. У 1932 г. асветніца пераехала ў Швейцарыю і пайшла ў манастыр, дзе ў 1945-м памерла.

**Было сказана**

**Леанід ДАЙНЕКА, пісьменнік:**
*«Ісціна не ў віне, не ў вайне. Ісціна ў нашых дзецях».*

---

■ Ну і ну!

# Сто адзежак і ўсе без засцежак...

Брэсцкія мытнікі канфіскавалі партыю тавару, які брастаўчанкі перавозілі на сабе. Як паведамілі ў прэс-службе Брэсцкай мытні, жанчыны 1949, 1954 і 1940 гадоў нараджэння спрабавалі перавезці тавары без мытнай дэкларацыі. Кожная з указаных грамадзянак апранула на сябе больш за дзясятак сукенак і іншых прадметаў адзення. Такім чынам яны перамяшчалі праз мяжу 38 прадметаў жаночага адзення рэйсавым аўтобусам у пункце пропуску «Варшаўскі мост».

Зыходзячы з асартыменту гэты тавар не мог быць аднесены да рэчаў асабістага карыстання. Таму і быў канфіскаваны да рашэння суда.

У прэс-службе мытні нагадалі, што норма бяспошліннага ўвозу складае 1500 еўра ў грашовым эквіваленце і 50 кілаграмаў у вагавым. Але гэта не азначае, што праз мытную мяжу Мытнага саюза можна везці, скажам, 50 кілаграмаў аднолькавых сукенак пад выглядам тавараў для асабістага карыстання. Улічваецца яшчэ і перыядычнасць паездак асобы, якая вязе тавар.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

---

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 4.48 | 21.41 | 16.53 |
| Віцебск | 4.30 | 21.38 | 17.08 |
| Магілёў | 4.38 | 21.31 | 16.53 |
| Гомель | 4.44 | 21.18 | 16.34 |
| Гродна | 5.05 | 21.55 | 16.50 |
| Брэст | 5.15 | 21.46 | 16.31 |

**Месяц**

***Апошняя квадра ў 22.23.***
***Месяц у сузор'і Авена.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Ефрасінні, Давыда, Мікалая, Пятра.*
***К.*** *Альжбеты, Рыгора, Яўгена.*

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.



# ЗАЎТРА




**...у суседзяў**

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +18..+20°C | КІЕЎ +26..+28°C | РЫГА +19..+21°C |
| ВІЛЬНЮС +19..+21°C | МАСКВА +24..+26°C | С.-ПЕЦЯРБУРГ +19..+21°C |

---

**УСМІХНЕМСЯ**

— Якіх выбітных правакатараў ты ведаеш?
— Толькі аднаго.
— Ну, кажы...
— Кампазітар Мендэльсон.
— Божухна, чаму?
— Для мільёнаў дурняў ён напісаў пяшчотны і прыцягальны «Вясельны марш», а сам... усё жыццё спакойна пражыў халасцяком.

**Мужык сказаў — мужык зрабіў выгляд, што нічога не казаў.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.092. Індэкс 63850. Зак. № 2746.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 7 ліпеня 2015 года.